PolotskSU



ноярской ГЭС село Усь-Ерба, деревни Иннокентьевна и Байкалово, в которых обитали переселенцы и их дети, попали в зону подтопления, а их жителей «укоренили» на новых местах.

Жизненные истории многочисленных потомков Корзунов, родившихся уже в Сибири, требуют специального исследования и подробного изложения в публикации другого формата. Думаю, что эти истории в контексте процесса миграции белорусов в Сибирь могли бы представлять интерес для витебских краеведов.

Так сложились обстоятельства, что в Минусинском уезде среди переселенцев оказались и Корзуны из деревни Жареньково Лепельского уезда. Можно предположить, что из этого семейства происходил заслуженный артист РСФСР Василий Иванович Корзун, родившийся в 1924 году в селе Большая Ерба.

В споре ученых о том, что стало основной причиной переселения крестьян в Сибирь: нищета или «земельный вопрос», история семьи Корзунов из деревни Ляшково служит аргументом в пользу последней точки зрения.

**В заключении** следует сказать о том, что родовое древо переселенцев насчитывает сегодня 209 персон. Три поколения, родившихся после 1950 года, составляют 87 человек, и только 2 из них обитают сейчас не в Сибири. Однако и в сельской местности продолжают жить лишь 3 потомка Корзунов, никто их которых не занят непосредственно в сельском хозяйстве. Уже в 20-х – 30-х годах прошлого века все еще дриссенская корзуновская молодежь тоже, как некогда представители поколения их отцов и дедов, потянулась из «родного гнезда», но не на новые земли, а в большой индустриальный и культурный центр – в Ленинград. Это было очередным веяньем времени, которое позже сделало горожанами и практически всех потомков переселенцев.

**Список использованных источников**

1. Крючек, П.С. Крестьянские переселения из Беларуси в годы столыпинской аграрной реформы / П.С. Крючек // Труды БГТУ. – 2017. – серия 6.– № 1. – С. 31–35.
2. Национальный исторически архив Беларуси. – Ф.2514. – Оп.1. – Д. 663.
3. Национальный исторически архив Беларуси. – Ф.2514. – Оп.1. – Д.1575.

**TO THE NEW LANDS (MIGRATIONS OF DRYSSA PEASANTS FROM WEST DVINA TO ENISEY)**

S. TUMANOV

*The paper illustrates long and complex historical process of migration. On the example of a specific peasant family from the village named Leshkovo (Drissa district, Vitebsk province), the roots of which the author was able to trace back to the beginning of the 18th century, it is shown how at the end of the 19th and beginning of the 20th centuries resettlement of "excess" Belarusian peasants to the undeveloped Siberian expanses of the Russian Empire was carried out. Difficulties in the development of new lands are shown. Brief information on the fate of the descendants of the migrants is given.*
***Key words:*** *resettlement, Passing certificate, village named Leshkovo, Drissa district, Vitebsk province, resettlement section of Kara-Ballyk, Abakan volost, Minusinsk district, Yenisei province; Korzuny, Gorbatye, Narubiny.*

УДК (726.59+75.052)(476.5) “16/18”

# ІКАНАСТАСЫ ХРАМАЎ МАРКАВА МАНАСТЫРА ВІЦЕБСКА Ў XVII–XIX СТСТ.: ПРАГРАМА, МАЙСТРЫ, СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АНАЛАГІ

**Флікоп-Світа Г.А.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*Праваслаўны мужчынскі манастыр у Маркаўшчыне ля Віцебска ўключаў некалькі храмаў, галоўным з якіх з’яўлялася царква Св. Троіцы, дзе з канца XVII да пачатку XX ст. знаходзіўся пяціярусны іканастас – выдатны ўзор беларускага барочнага іканастаса. Гэты помнік, зафіксаваны на здымках, неаднаразова прывабліваў увагу спецыялістаў, аднак іканастасы іншых храмаў Маркава манастыра, якія былі змайстраваны пазней, ніколі не выступалі аб’ектамі спецыяльнага даследавання. Між тым, вывучэнне іх стылістыкі і сюжэтнага складу дае ўяўленне пра мастацкую эвалюцыю і развіццё праграмы алтарных агароджаў Беларусі ўвогуле і г. Віцебска ў прыватнасці. У дадзеным артыкуле на аснове архіўных матэрыялаў здзейснена навуковая рэканструкцыя праграмы іканастасаў у манастырскіх цэрквах Св. Троіцы, Св. Пятра і Паўла, Пакрова, Св. Параскевы, Св. Мікалая і бакавых прыдзелаў.*
***Ключавыя словы:*** *іканастас, Маркаў манастыр, Віцебск, царкоўны інтэр’ер.*

Старажытны мужчынскі манастыр у мясцовасці Маркаўшчына ля Віцебска з даўніх часоў з’яўляўся адным з найбольш значных праваслаўных духоўных асяродкаў на Беларусі. Яго гісторыя [1], архітэктура цэркваў [2 – 4], мастацкая спадчына храмаў [5 – 7], кніжныя зборы [8] неаднаразова выступалі аб’ектамі даследаванняў. Жывапісу была нададзена асобная ўвага ў публікацыях мастацтвазнаўцаў Н. Трыфанавай і Л. Вакар [5 – 7]. Даследчыцамі вывучаліся роспісы сценаў манастырскай царквы Св. Троіцы, якія, безумоўна, заслугоўваюць самай пільнай увагі. Такой жа ўвагі, на нашую думку, заслугоўваюць і іканастасы манастарскіх цэркваў. Між тым, толькі адзін з іх – самы старажытны і ўражваючы – у Троіцкай царкве – засяроджваў на сабе позіркі спецыялістаў [9 – 11]. Хаця пры гэтым і ён не быў вывучаны ў дастатковай ступені, бо нават адносна яго праграмы ў розных крыніцах сустракаюцца розныя звесткі: Э. Вецер называе яго трох’ярусным [9, с. 190], І. Духан налічвае ў ім чатыры рады абразоў [10, с. 73], а, як будзе паказана ніжэй, рэгістраў было пяць. Такім чынам, хоць некаторыя аспекты, датычныя мастацкай спадчыны Маркава манастыра і патраплялі пад увагу спецыялістаў, аднак паўнавартаснае даследаванне іканастасаў храмаў гэтай абіцелі праведзена не было.

PolotskSU



Манастыр быў заснаваны ў 1642 г. Львом Самуілам Агінскім, а ў 1690 г. ягоным сынам на месцы пагарэлай царквы была ўзведзена новая – драўляная бажніца, асвечаная ў 1691 г. ў імя Св. Троіцы [12, с. 10 – 15]. Гэты храм з'яўляўся галоўным на тэрыторыі манастыра, хаця не адзіным. З сярэдзіны XVII ст. існавала царква Св. Пятра і Паўла. Першапачаткова яна была драўлянай, але неаднаразова гарэла, пакуль у 1760 г. не была вымуравана новая, асвечаная ўжо ў гонар Пакрова Багародзіцы (буданак захаваўся да нашых дзён, у адрозненне ад іншых манастырскіх цэркваў, якія былі разбураныя ў савецкі перыяд). У гэтым жа будынку, дзе месцілася халодная Пакроўская царква, знаходзілася і цёплая царква Св. Пятра і Паўла. У 1847 г. у Пакроўскай царкве быў асвечаны бакавы прыдзел ў гонар епіскапа варонежскага Св. Мітрафана. У 1889 – 1890 гг. з'явіліся дзве прыбудовы да Пакроўскай царквы, у адной з якіх знаходзілася панамарня, у другой – прыдзел Св. Евангеліста Марка [12, с. 49; 13]. Зразумела, што як і ў цэнтральным храме, так і ў кожным з прыдзелаў былі іканастасы. Дагэтуль яны ніколі не выступалі аб'ектамі даследавання.

Акрамя таго, за тэрыторыяй знаходзіліся яшчэ дзве царквы, якія адносіліся да манастыра. Драўляны храм Св. Мікалая быў збудаваны ў 1730 г. за агароджай. Пазней, калі прыйшоў ў заняпад, быў адбудаваны на тым жа месцы. Даследчыкі гісторыі манастыра выказвалі здзіўленне такому размяшчэнню храма і выказвалі версію, што, напэўна, царква была ўзведзена за манастырскай агароджай, бо вакол яе быў цвінтар [12, с. 50]. Сапраўды, гэтыяназіранні падмацоўваюцца архіўнымі дакументамі. У апісанні манастыра за 1800 г. храм Св. Мікалая фігуруе пад такім запісам: *"церковь деревянная во имя Святителя чудотворца Николая за оградой монастыря на кладбище"* [14].

Таксама ў 1730 г. была ўзведзена і драўляная царква Св. Параскевы ў манастырскім фальварку Шыдлоўшчыне ў 1,5 верстах ад манастыра. У 1842 г. яна была перабудавана і зноў жа асвечана ў гонар Св. Параскевы [12, с. 51].

З прыведзенай гісторыі ўзвядзення цэркваў вынікае, што ўжо ў першай палове XVIII ст. манастыр іх налічваў чатыры: Св. Троіцы, Св. Пятра і Паўла, Св. Мікалая, Св. Параскевы. Пазней яны перабудоўваліся, у некаторых з іх былі ўладкаваны бакавыя прыдзелы. Выяўленыя крыніцы сведчаць пра праграму іканастаса 1690 г. у царкве Св. Троіцы, а таксама даюць уяўленне пра іканастасы (пазначаныя тут гады вырабу гіпатэтычныя) 1730 г. у царкве Св. Мікалая, 1770-х гг. у Пакроўскай халоднай і Петра-Паўлаўскай цёплай цэрквах, першай трэці XIX ст. у прыдзеле Троіцкай царквы, 1840 г. у царкве Св. Параскевы, 1890 г. у прыдзеле Св. Марка Пакроўскай царквы.

Разгляд іканастасаў гэтага манастыра пачнём з найбольш вядомага і старажытнага помніка, які быў у **царкве Св. Троіцы**. Ён, як і астатнія іканастасы манастыра, пра якія будзе гаворка ісці ніжэй, на жаль, не захаваўся, аднак вядомы па фотаздымках пачатку XX ст. Тады былі адзняты не толькі іканастас, але і роспісы Троіцкага храма, разьбяныя ўваходныя дзверы. Здымкі захоўваюцца ў фотааддзеле архіва Інстытута гісторыі матэрыяльнай культуры РАН у Санкт-Пецярбургу (ИИМК РАН) [15].



**Малюнак 1. – Іканастас 1690 года ў царкве Св. Троіцы Маркава манастыра ў Віцебску.**
**Фота канца XIX – пачатку XX ст. з фотаархіва ИИМК РАН**

Іканастас Троіцкай царквы быў змайстраваны, відавочна, ў 1690-1691 гг., бо менавіта тады быў асвечаны храм [1, с. 115]. Над яго вырабам працавалі разам з мясцовымі майстрамі і прыгонныя сяляне Агінскага – фундатара храма [6, с. 98]. Вядома, што прымаў удзел і разьбяр з Магілёва І. Магілёвец [10, с. 73]. Даследчыца Э. Вецер памылкова адзначае, што гэты іканастас трох'ярусны [9, с. 190]: верагодна, яна не мела магчымасці азнаёміцца з помнікам па якасных здымках, дзе акрамя трох дамінуючых радоў бачны і два іншыя, прадстаўленыя маленькімі круглымі іконамі. І. Духан, які характарызаваў іканастас як чатырох'ярусны [10, с. 73], відавочна, клеймы ў навершшы разглядаў як дэкаратыўную аздобу, а не як рэгістр абразоў, аб'яднаных агульнай тэмай (тым больш, што сутнасць выяў у гэтых медальёнах па здымках разабраць не магчыма).

PolotskSU



Аднак, як будзе паказана, гэтая алтарная агароджа складалася з пяці сюжэтна-тэматычных цыклаў: мясцовага, святочнага, апостальскага, прарочага чыноў, а таксама мела яшчэ адзін – самы верхні, дзе, на жаль, па фотавыяве не магчыма разабраць сюжэты ў невялікіх клеймах, закампанаваных сярод разьбы.

Поўнае ўяўленне пра праграму іканастаса даюць яго ранейшыя апісанні. У архіўнай справе з НГАБ маюцца вопісы цэркваў Маркава манастыра за 1818 і 1830 гг. з пералікам маёмасці, а паміж гэтымі вопісамі ў той жа рукапіснай кнізе прыведзена падрабязнае апісанне іканастасаў Троіцкага храма (галоўнага і ў прыдзеле). Дата тут не ўказана, покрыс адрозніваецца ад тых, якімі зроблены запісы ў 1818 і 1830 гг., але можна меркаваць, што гэтае апісанне здзейснена паміж названымі гадамі [16, арк. 24 – 26]. Зрэшты, у выпадку з разглядаемым іканастасам гэта не так і важна, бо ён заставаўся, відавочна, нязменным ад моманту ўсталявання да моманту яго фіксацыі на фота ў пачатку ХХ ст. А згаданы дакумент толькі дапаўняе звесткі пра тое, чаго не бачна на здымку.

З яго вынікае, што ў першым ярусе былі яшчэ, акрамя адлюстраваных на фота ікон Божай Маці і Ісуса Хрыста, Царскай Брамы і дыяканскіх дзвярэй з выявамі Міхаіла Арханёла і Яна Правазвесніка, абразы (на здымку іх не відаць, бо знаходзіліся пакраях) Уваскрасення Хрыстова (злева) і Троіцы (справа) [16, арк. 24 – 26]. Далей у апісанні пералічваюцца верхнія ярусы – святочны, апостальскі, прарочы з указаннем зместу цэнтральных абразоў. Больш падрабязную інфармацыю пра склад другога чына можна атрымаць з іншых крыніц, на што звярнуў увагу даследчык І. Духан: *"по описям конца XVIII – первой половины XIX веков праздники состояли из шести небольших клейм, в которых были размещены сгрупппированые по две иконы (слева направо): "Рождество Богородицы" и "Введение во храм Богородицы", Рождество Христово и "Богоявление", "Сретение и Благовещение", "Вход в Иерусалим и Воскресение", "Вознесение" и "Сошествие Св. Духа", Преображение и Успение Богородицы"* [10, с. 73]."

Пра навершша ў апісанні за 1818 – 1830 гг. гаворыцца: "*вверху распятие в киоте резном золочёном и около – «страсти» в клеймах деревных золочёных"* [16, арк. 24 – 26]. Такім чынам, верхні ярус быў пакутніцкім. На дадзены момант гэта адзінае дакладнае сведчанне наяўнасці такога цыклу ў беларускім іканастасе XVII ст. (іншы вядомы нам чын Хрыстовых пакутаў быў у больш познім іканастасе – базыльянскай царквы г. Талачына і складаўся з пяці вялікага памеру абразоў [17]). Аднак верагодна, што такая ж праграма як і ў Віцебскага помніка, была і ў двух іканастасах XVII ст. г. Магілёва.

Тое, што гэты мастацкі комплекс мае непасрэдную блізкасць да помнікаў у Богаяўленскім (страчаны) і Мікалаеўскім (адрэстаўраваны) манастырскіх храмах г. Магілёва вынікае з візуальнага аналізу. На гэта неаднаразова звярталі ўвагу нашыя папярэднікі [9 – 11]. Магчыма, што і там у навершшы былі прадстаўлены ў клеймах выявы на сюжэты апошніх дзён зямнога жыцця Ісуса Хрыста. Аднак, на жаль, дакладных звестак пра гэта на дадзены момант у нас няма.



**Малюнак 2. – Іканастас 1636 г. у галоўным храме Богаяўленскага манастыра г. Магілёва. Фота пачатку ХХ ст. з НГМ РБ**



**Малюнак 3. – Іканастас 1672 г. у галоўным храме Мікалаеўскага манастыра г. Магілёва. Сучасны стан пасля рэстаўрацыі. Фота аўтара**

З літаратурных крыніц вядома і пра яшчэ адзін аналаг віцебскага іканастаса. У царкве Уваскрасення Божага г. Дзісны *"Иконостас был прямой, о 5 ярусах, резной из дерева: по голубому полю вызолоченные карнизы, гроздья, листья, цветы. Царские врата все были резные вызолоченные. Все иконы писаны на дереве масляными красками. На верху иконостаса стоял деревянный крест с резным распятием, а по сторонам его два ангела, вырезанные из дерева. Иконы отделялись одно от одной резными колонками. Знатоки восхищались иконостасом, напоминавшим такой же в Витебском Свято-Троицком Марковом монастыре. Во время пожара спасены Царские врата и все местные иконы"* [18, приложение, с. 105]. На жаль, з чатырох згаданых комплексаў захаваўся толькі адзін, ды і тое фрагментарна (зараз адрэстаўраваны) – у саборы Св. Мікалая жаночага манастыра г. Магілёва (паколькі іконы ў ім новыя, напісаныя не на ранейшыя сюжэты, то і праграма ўсяго комплекса не адпавядае яго колішняму сюжэтнаму складу).

Акрамя прааналізаванага вышэй іканастаса канца XVII ст. **у Троіцкай царкве** Маркава манастыра ў першай трэці XIX ст. знаходзіўся і іншы – **у правым прыдзеле** (тытул гэтага храма ў вядомых нам архіўных крыніцах не ўказаны, але ў

PolotskSU



сваіх падарожных нататках пра яго адзначае Д. Струкаў – прыдзельны храм Уваходу ў Ерасалім [19, с. 19]). У згаданым вышэй апісанні за 1818 – 1830 гг. ён фігуруе як новы, невялікі: *“Тот иконостас в высоту 4 с половиной, а в ширину 5 аршин. В первом поясе образ Спасителя стоящий, второй образ праведных Иоакима и Анны. На левой стороне образ Богоматери, стоящий с превечным младенцем. Второй образ Введения Божьей матери. В другом поясе образ Спасителя со стоящими посторонам Апосталами Петра и Павла”* [16, арк. 25 адв.]. Далейшы запіс крыху неразборлівы, а таму не зразумела, ці то тут жа побач з Апосталамі, ці то ўсё ж такі ў наступным ярусе (што звычайна і было), знаходзіліся выявы Пракрокаў. Уверсе быў абраз Божай Маці Чанстахоўскай: ён быў альбо паміж “Прарокаў” (калі яны былі ў трэцім ярусе), альбо вышэй за іх (калі яны былі ў тым жа поясе, што і “Апосталы”).

Тут на сябе звяртае ўвагу ўключэнне ў праграму абраза “Божай Маці Чанстахоўскай”. Паводле звестак з пісьмовых крыніц XVIII ст. і выяў нешматлікіх іканастасаў вядома, што ў прарочым чыне найчасцей уцэнтры знаходзілася багародзічная выява тыпу “Прадвесце”. Разам з іконамі старазапаветных Прарокаў гэта ўсё мела пэўную семантыку – увасабленне прароцтваў пра прыход Збавіцеля. Тут жа прадстаўлена выява тыпу “Адзігітрыя”.

**Пакроўская мураваная царква**, як было адзначана напачатку артыкула, была ўзведзена на месцы папярэдняй ў 1760 – 1763 гг., але асвечана толькі ў 1777 г. [1, с. 118]. Відавочна, тады ж і быў зроблены іканастас, фота якога захавалася да нашага часу [13]. Наколькі нам вядома, ніхто з даследчыкаў сакральнага мастацтва на гэтую выяву не спасылаўся. А іканастас, зафіксаваны на ёй, ніколі не падлягаў вывучэнню. На здымку выдатна бачна арыгінальная будова, аднак, на жаль, зусім немагчыма разабраць сутнасць выяў.



**Малюнак 4. –Іканастас 1777 г. (?) у царкве Пакрова Маркава манастыра г. Віцебска. Фота канца XIX – пачатку XX ст.**

Тут ужо крыніцай з’яўляецца кантракт за 1846 г. з майстрам, вяземскім мешчанінам Смаленскай губерні Іванам Якаўлевічам Сяўруковым (Севрюков) на пазалоту іканастаса. У дамове з ім падрабязна пералічваюцца віды работ, якія ён павінен ажыццявіць – а гэта пазалота пэўных архітэктурных элементаў (карнізаў, пілястраў) і дэкаратыўных дэталяў (рам вакол абразоў, разьбяных картушоў і г.д.) іканастаса. Пры іх указанні адзначаюцца, як арыенціры, іконы, што дае ўяўленне пра колькасць абразоў, іх змест і паслядоўнасць размяшчэння. Дзякуючы гэтаму можна ўявіць выгляд усёй структуры, нават тых частак, якія на фота не бачныя.

Прывядзём тут тыя вытрымкі з кантракта, у якіх згадваюцца абразы:

*“Царские двери кроме живописи в клеймах же вызолотить ... с). Так же вызолотить плат над оными, ...и корону над платом; выше ад Царскими вратами около клейма, в коем изображена Тайная Вечеря, резьбу и над оным клеймом облака с Богоотцем, что относится к первому ярусу иконостаса ...; д). в том же ярусе две резные при наместных иконах и четыре при иконах, что по сторонам за южными и северными дверьми, оборчатые рамы с наугольными раковинами… е). над этими рамами резьбу около шести клейм с живописными праздниками; <…> Во втором ярусе: 1. Карнизную оборку арки что над Царскими Вратами и по ней резные листы в арке, облака сияние, раму малой иконы Божией Матери, двух ангелов по сторонам арки, к). резьбу около трёх клейм из коих одно над аркою и два по сторонам оной с живописными изображениями; 1. Небольшие рамы около шести икон Апостольских с верхними раковинами при них, четыре херувима между рамами… т). три рамы: около больших икон: Спасителя, Божией Матери и Предтечи Иоанна… <…> В третьем ярусе р). резьбу рококо около иконы Божией Матери и двух клейм с пророческими иконами таковую резьбу овальную оборку над крестом… v). … так же крылья у двух ангелов по сторонам иконостаса в третьем ярусе…”* [20, арк. 7 – 8 адв.]. За матэрыялы і працу манастыр мусіў заплаціць майстру 650 рублёў срэбрам. Заказ павінен быць скончаны да 1 кастрычніка 1846 г.

Дзякуючы гэтаму кантракту стала вядома, што паводле сваёй праграмы іканастас складаўся з чатырох чыноў, хаця, калі меркаваць па яго канструкцыі на здымку, гэта зразумець цяжка. Мясцовы рад меў такі склад: уцэнтры – Царская Брама

PolotskSU



з клеймамі, злева ад яе – абраз Багародзіцы, справа – Хрыста; далей за кожным з гэтых абразоў дыяканскія дзверы, а за імі – яшчэ па два абразы (сюжэты не вядомыя). Над гэтымі шасцю абразамі ніжняга яруса ў маленькіх круглых клеймах было 6 святочных абразоў (па тры з кожнага боку). А таксама над дыяканскім дзвярыма было па адной выяве.

Асаблівую цікавасць уяўляе даволі пышнае ўбранне над Царскай Брамай. Непасрэдна над дзвярыма знаходзілася, напэўна, выява "Спас Нерукатворны", якая ў кантракце згадваецца як "плат". Над ёй была разьбяная карона, вышэй – ікона "Тайная Вячэра", а над ёй – разьбяная кампазіцыя з Богам-Айцом у аблоках (на здымку гэтага не бачна за жырандоляй). Усё гэта было ўпісана ў арку, над якой у разьбяным невялікім картушы знаходзілася выява Багародзіцы, а паабапал аркі (над мясцовымі абразамі Багародзіцы і Хрыста) – у клеймах выявы анёлаў.

Трэба адзначыць, што паводле архітэктурнай будовы іканастас складаецца з двух ярусаў, раздзеленых карнізам, і картуша, які можа быць трактаваны як верхні ярус (што і бачна ў прыведзенай цытаце), тады як яго праграма прадстаўлена чатырма сюжэтна-тэматычнымі чынамі. Дарэчы, з-за гэтага часам узнікае разначытанне пры характарыстыцы іканастасаў: напрыклад, у архіўных крыніцы за 1822 г., дзе ён апісваецца, сказана, што іканастас мае два ярусы, а пры пераліку абразоў вынікае, што іх – чатыры. Таму трэба адрозніваць, калі гаворка ідзе пра будову, а калі – пра праграму. Тое ж датычыцца і іканастаса ў цёплай царкве Пятра і Паўла, пра які ў вопісе за 1822 г. гаворыцца, што ён аднаярусны, але, як будзе пакана ніжэй, ён утрымліваў тры тэматычныя цыклы абразоў [6, с. 99].

Вяртаючыся па іканастаса халоднай Пакроўскай царквы адзначым, што незвычайнай канструкцыяй тут быў прадстаўлены другі архітэктурны ярус, дзе знаходзіліся трэці і чацвёрты чыны. Цэнтральная яго частка з трыма ключавымі абразамі (над Царскай Брамай і іконамі Багародзіцы і Хрыста) мае значна большую вышыню за бакавіны. Яна па вышыні такая ж, як і першы ярус. З прыведзенай вытрымкі кантракту вынікае, што тут у самым цэнтры трэццяга чына была выява Хрыста (відавочна, на прастоле), а паабапал яго знаходзіліся злева – Багародзіца, справа – Ян Правазвеснік. З двух бакоў размешаны па тры абразы Апосталаў. Паводле здымка немагчыма разабраць персанажаў, аднак можна ўгледзець, што на кожным творы прадстаўлена парная выява. Такім чынам, тут быў поўны дэісусны рад.

Нетыповым для беларускіх іканастасаў з'яўляецца раздзяленне кампазіцыі "Дэісус" на тры асобныя творы, як у рускіх іканастасах. Справа ў тым, што найчасцей у айчынных комплексах уцэнтры гэтага цыкла знаходзілася ікона, на якой былі прадстаўлены Хрыстос на прастоле, а паабапал яго роставыя выявы Багародзіцы і Яна Правазвесніка. Вядомы таксама прыклады, калі на цэнтральнай іконе быў напісаны толькі Ісус Хрыстос, а паабапал гэтага абраза знаходзіліся выявы Апосталаў: асобных ікон Багародзіцы і Яны Правазвесніка не было [21].

У чацвёртым чыне ў картушах знаходзілася выява Багародзіцы пацэнтры, а паабпал яе па адной выяве Пракрокаў. У навершшы, што з'яўляецца традыцыйным, было Укрыжаванне з перадстаячымі – фігуры Багародзіцы і Яна Багаслова.

Гэты іканастас быў змайстраваны, найбольш верагодна, калі адбылася адбудова храма. Ён з'яўляецца рэдкім прыкладам чатырох'яруснай агароджы сярэдзіны XVIII ст. Справа ў тым, што праваслаўных цэркваў, дзе акурат і сустракаліся ў той час высокія іканастасы, на тэрыторыі Беларусі ў гэты перыяд было мала. А ва ўніяцкіх цэрквах, якіх была пераважная большасць, у той час алтар альбо ўвогуле быў адкрытым, альбо перад ім змяшчалася невысокая агароджа, найчасцей у адзін – два чыны. Трох- і чатырох- ярусныя іканастасы сустракаліся, але ў агульнай масе іх была меншасць [22 – 23].

Канструкцыйным аналагам з'яўляецца іканастас у манастырскай царкве Праўтварэння Божага г. Магілёва. Гэты помнік, у адрозненне ад двух іншых магілёўскіх іканастасаў – з Богаяўленскага і Мікалаеўскага манастыроў – аб'ектам даследавання ніколі не выступаў. Акрамя адной публікацыі, здзейсненай у пачатку ХХ ст., ён больш не падлягаў увазе спецыялістаў [24, с. 116 – 118]. Разам з тым, гэта надзвычай цікавы твор, які мае шмат агульнага з прааналізаваным іканастасам з Пакроўскай царквы Маркава манастыра.



**Малюнак 5. – Іканастас 1762 г. (?) у храме Пераўтварэння г. Магілёва. Фота пачатку ХХ ст. з фотаархіва ИИМК РАН**

PolotskSU



Паказальна – царква Пераўтварэння ў г. Магілёве, якая існавала здаўна (першая згадка належыць да 1447 г.) і шмат разоў адбудоўвалася, была чарговы раз адноўлена ў 1762 г. Менавіта гэты будынак і працягваў тут знаходзіцца да свайго разбурэння ў гады Вялікай Айчыннай Вайны, пасля чаго не аднавіўся, і менавіта яго інтэр'ер зафіксаваны на здымку, апублікаваным у 1916 г. у "Известиях императорской археологической комиссии".

Пра час будовы гэтага іканастаса гаворка ў дадзеным выданні не ідзе, а іншыя спецыялісты на ім ніколі ўвагу не засяроджвалі. Аднак няма сумневу, што гэты цудоўны барочны помнік належыць менавіта да сярэдзіны XVIII ст. Відавочна, што ён і быў усталяваны пасля адбудовы храма ў 1760-ыя гг. Падкрэслім, што да таго ж часу належыць і іканастас, калі яго датаваць часам узвядзення будынка, Пакроўскай царквы Маркава манастыра ў Віцебску.

Абедзве алтарныя агароджы маюць аднолькавую канструкцыю. Воблік іканастасаў сфарміраваны не плоскасна, як у пераважнай большасці, а мае аб'ёмна-прасторавую кампазіцыю. Іх падабенства можа быць патлумачана агульным перыядам стварэння і адпаведна – пэўнымі тагачаснымі тэндэнцыямі, аднак, на нашую думку, тут магло мець месца агульнае аўтарства. На жаль, на фота магілёўскага іканастаса бачна толькі яго цэнтральная частка без бакавых, таму не вядома, ці былі тут выкарыстаны той жа прыём, што і ў віцебскім – паніжэнне бакавінаў. Цікава, што ў 1870-х гадах, як адзначаюць прадстаўнікі Імператарскай археалагічнай камісіі, магілёўскі *"иконостас исправлен… московским мастером Москалёвым"* [24, с. 116 – 118]. Гэтае ж прозвішча мы будзем згадваць ніжэй, калі размова будзе ісці пра іншыя іканастасы Віцебскага Маркава манастыра.

Яшчэ адным вядомым нам аналагам, паводле канструкцыі, з'яўляецца іканастас для царквы, якая ў 1708 г. была пабудавана ў паселішчы Лясное ля Магілёва, адкуль у 1748 г. была перанесена ў Галавенчыцы. Іканастас і бакавыя алтары ў ёй былі змайстраваны ў 1795 г. – пазней за два вышэй згаданыя іканастасы [25, арк. 44 – 45]. Верагодна, такая структура была лакальнай з'явай у другой палове XVIII ст. на Віцебшчыне і Магілёўшчыне.

Астатнія іканастасы храмаў Віцебскага Маркава манастыра вядомы толькі па пісьмовых згадках – іканаграфічныя крыніцы пакуль не выяўлены. У 1839 г., 10 снежня, быў заключаны кантракт паміж манастыром і жывапісцам, смаленскім мешчанінам Герасімам Іванавічам Маскалёвым на ўзнаўленне іканастаса **цёплай царквы Св. Пятра і Паўла**, якая знаходзілася ў адным будынку з Пакроўскай царквой. Прозвішча "Маскалёў" праўда без указання імя фігуруе ў справе па рамонце іканастаса ў царкве Пераўтварэння г. Магілёва ў 1870 г. Майстар там згадваецца як маскоўскі. Тут жа Маскалёў фігуруе як смаленскі мешчанін. Цяжка вызначыць, ці адзін маецца на ўвазе чалавек у абодвух выпадках, ці розныя. Гэтае пытанне можа стаць тэмай для асобнага даследавання.

Паводле дамовы, заключанай з Г.І. Маскалёвым, у Петра-Паўлаўскай царкве ён мусіў *"Написать вновь живописью все иконы, кроме что в клеймах, - шести в Царских Вратах, над оными Тайной Вечери и шести Пророков, которые не переписывая вновь, исправить живописью так, чтобы оных нисколько не отличали от вновь написанных икон"* [26, арк. 1]. Акрамя гэтага ён павінен быў расчысціць пазалоту і пасерабрэнне, перафарбаваць пэўныя элементы дэкора і г.д. Працы павінны быць скончаныя да Вялікадня 1840 г., манастыр абавязваўся заплаціць 240 руб. асігнацыямі.

З прыведзенага кантракту вынікае, што іканастас у цёплай царкве быў з ранейшых часоў. Паколькі яму патрабаваўся рамонт у 1839 г., то можна дапусціць думку, што ён быў устаноўлены яшчэ ў XVIII ст. Калі за дату вырабу іканастаса прыняць дату асвячэння гэтай цёплай царквы, то яго можна датаваць 1777-м годам. З прыведзенага фрагмента дамовы вынікае, што ў іканастасе быў прарочы ярус. Такім чынам, як мінімум тры сюжэтныя цыклы тут былі: мясцовы, дэісусны і прарочы. Мала верагодна, што быў святочны чын, бо звычайна святочныя абразы размяшчаліся ў клеймах, а тут жа сярод такіх выяў згадваюцца толькі іконы Пракокаў і медальёны на Царскай Браме.




**Малюнак 6. – Іканастас 1795 г. у храме в. Галавенчыцы Магілёўскай губерні. Фота пачатку XX ст. з фотаархіва ИИМК РАН**

PolotskSU



Хоць кантракт і быў заключаны яшчэ ў 1839 г., аднак прыступіць да працы майстар змог не раней за 1847 г. Справа ў тым, што, як вядома з архіўных крыніц, у 1846 г. архімандрыт Віцебскага Маркава манастыра Павел накіраваў у Полацкую духоўную кансісторыю рапарт пра неабходнасць рамонту іканастасаў у халоднай Пакроўскай і цёплай Петра-Паўлаўскай цэркваў і ўзнаўленне прыдзелу Св. Мітрафана і прасіў дазволу на выкарыстанне "остаточную" сумы за 1844 і 1845 гг. Цікава, што ён нават далучыў да рапарта малюнак мяркуемага іканастаса (у архіўнай справе яго няма), праўда не зразумела, для якога з прыдзелаў. Верагодна, меўся на ўвазе іканастас для новага прыдзела Св. Мітрафана, бо ў Пакроўскай і Петра-Паўлаўскай цэрквах іканастасы былі – яны папросту рамантаваліся [27, арк. 1 – 2]. Хаця магчыма і тое, што гэта быў малюнак існуючага іканастаса з мяркуемымі ў ім зменамі.

Пра прыдзел Св. Мітрафана іераманах Сергій у сваім "сачыненні" за 1865 г. адзначае, што ён уладкаваны на месцы колішняй Петра-Паўлаўскай царквы [12, с. 49]. Адзначым, што на 1865 г. цёплая царква Св. Пятра і Паўла не згадваецца, а гэта пры тым, што ў ёй у 1846 г. праводзіліся рамонтныя працы. Магчыма, што менавіта яна пасля аднаўлення была асвечана ўжо ў гонар Св. Мітрафана. Гэта не супярэчыць прыведзеным вышэй звесткам з прашэння архімандрыта ў кансісторыю: іканастасы былі ў Пакроўскай і Петра-Паўлаўскай цэрквах, што ён і ўказвае. Але пасля такіх працаў (і любых іншых працаў у алтары) храм трэба зноў асвячаць, а таму ён і прасіў дазволу на асвячэнне прыдзелу ў гонар Св. Мітрафана.

Зразумела, што калі ў 1846 г. была неабходнасць у рамонце іканастаса, то ён не быў адрамантаваны па нейкай прычыне ў 1839 г. Дарэчы, як вядома з прыведзеных звестак вышэй, у 1846 г. быў заключаны кантракт з пазалотчым на пазалоту халоднай царквы ў гэтым жа будынку. Адсюль можна зрабіць выснову, што этапы былі такія: архімандрыт знаходзіў майстроў, якія агучвалі каштарыс на неабходныя віды работ, пасля чаго ён шукаў неабходныя грошы і прасіў у епархіальнага начальства дазволу на іх выкарыстанне для прапісаных мэтаў. Верагодна, з-за таго, што на рамонт інтэр'еру гэтага мураванага будынку сумы патрабаваліся вялікія, альбо па нейкай іншай прычыне, гэтая праца была адкладзена на некалькі гадоў. Вядома, што на канец лістапада 1847 г. рамонтныя працы ў цёплай царкве быві завершаныя і гаворка ішла пра яе асвячэнне [27, арк. 3]. Але пакуль тут была пратэрміноўка паміж 1839 і 1847 гг. тым часам жывапісцам Г.І. Маскалёвым быў выкананы іншы заказ.

Так, 26 жніўня 1840 года з мастаком была заключана дамова на выраб ікон для іканастаса царквы **Св. Параскевы** на суму 260 рублёў асігнацыямі, якія ён і атрымаў, што вынікае з прыпіскі пад кантрактам. Г.І. Маскалёў мусіў *"весь иконостас и места в тумбах раскрыть вновь колерами"* і напісаць абразы. З гэтага дакумента нельга атрымаць уяўленне пра поўную праграму, бо звесткі прыводзяцца павярхоўныя. Вядома толькі, што для мясцовага чыну павінны быць напісаны чатыры абразы, два з якіх – "Св. Параскева" і "Св. Юрый Змеяборац", а таксама трое дзвярэй. У верхнім ярусе мусіла размясціцца "Уваскрасенне" і яшчэ 10 абразоў [28, арк. 1].

Праграма гэтага іканастаса робіцца вядомай з акта агляду царквы пасля завяршэння работ па яе рамонце ў 1842 г. [29]. У мясцовым чыне знаходзіліся чатыры абразы, Царская Брама з шасцю жывапіснымі клеймамі (Дабравесце ў двух і чатыры Евангелісты), двое дыяканскіх дзвярэй. Іх размешчэнне было такім: справа ад Царскай Брамы – "Збавіцель", дзверы з выявай Архідыякана Стэфана, храмавая ікона "Св. Параскевы"; злева – "Багародзіца", дзверы з выявай Св. Лаўрэнція, "Св. Юрый-Змеяборац"; уверсе – "Тайная Вячэра".

Цікавасць уяўляе другі ярус, які апісваецца наступным чынам: *"Во втором ярусе посредине положение Спасителя во гроб, а по сторонам иконы Апостолов Петра и Павла, мученицы Фёклы, Екатерины, Варвары, преподобной матери Евфросинии Княжны Полоцкой, Анастасии и Святителя Митрофана Воронежского. По выше карниза сего яруса по сторонам два образные ангела, представляющие новый и ветхий завет. В третьем ярусе Воскресенье Христа Спасителя с Ангелами и мироносицами в образных видах"* [29, арк. 1 адв. – 2]. Як вынікае з пераліку, другі ярус быў прадстаўлены выбранымі Святымі. Такая практыка ў той час, па ўсёй верагоднасці, мела месца, хаця і не была вельмі пашыранай. Цікавасць уяўляе і цэнтральная ікона "Палажэнне ў дамавіну", што з вядомых нам на цяперашні момант крыніц не мае аналагаў сярод беларускіх іканастасаў.

Абагульняючы звесткі пра іканастас царквы Св. Параскевы адзначым, што ў ёй у 1840 г. быў уладкаваны трох'ярусны іканастас з новымі абразамі. Канструкцыя магла быць і з ранейшых часоў, пра што складана меркаваць з вядомых нам дакументаў.

У 1849 г. зноў жа з Г.І. Маскалёвым была заключана дамова на напісанне і рэстаўрацыю абразоў для адрамантаванай **царквы Св. Мікалая**. Прывядзём той фрагмент кантракту, які дае ўяўленне пра праграму іканастаса: *"1. Написать вновь на досках приготовленных от монастыря в нижнем ярусе иконостаса: а). на южной двери Архангела Гавриила, в третьем ярусе б). Киево-Печёрскую Божию Матерь по сторонам её на особых досках преподобных Антония и Феодосия Печёрских; во втором ярусе умовения Спасителем ног Апостолов с). на 10 клеймах назначенных над иконами в разных местах иконостаса, Праздники Господские и Богородичные, кои указаны будут от настоятеля Монастыря, д). в 4м ярусе Святую Троицу с Богоматерию образных; е). Возобновить надлежащим образом прежнию живопись 12ть Апостолов, применяясь к древнему штилю живописи а так же 12 Пророков в малых клеймах при Апостолах с написанием вновь недостающего одного Пророка и 4х Праотцев в тех же клеймах, а равно и Нерукотворённого образа над Царскими Вратами"* [28, арк. 3].

Такім чынам, іканастас тут быў з ранейшых часоў і, як і ў папярэдніх выпадках, можна меркаваць, што ён быў змайстраваны ў XVIII ст., паколькі неабходнасць рэстаўрацыі і замены абразоў узнікла ў сярэдзіне XIX ст. Вядома, што царква была ўзведзена ў 1730 г., а звестак пра пазнейшыя яе перабудовы і пераасвячэнні да сярэдзіны XIX ст. няма. Можна меркаваць, што жывапісец Г.І. Маскалёў мусіў рэстаўраваць абразы, напісаныя ў 1730-м годзе. Іканастас складаўся з чатырох чыноў: мясцовага, святочнага, апостальскага, прарочага. Абразы Божых Святаў, а таксама выявы Пракокаў і Праайцоў былі напісаны ў невялікіх клеймах, што з'яўляецца даволі пашыраным. Уласцівасцю беларускіх іканастасаў таксама з'яўляецца і тое, што Пракокі і Праайцы знаходзіліся ў агульным чыне, тады як, напрыклад, у рускіх іканастасах таго часу яны былі размешчаны ў двух розных рэгістрах.

Звяртае на сябе ўвагу тое, што для іканастаса была заказана жывапісцу выява Божай Маці Кіева-Пячэрскай, прадстаўленай на трох асобных дошках. Справа ў тым, што ў XIX ст. у беларускім іканапісе атрымала пэўнае пашырэнне такая выява, кампазіцыя якой уключала Божую Маці на прастоле з маленькім Хрыстом у яе на каленях, а паабапал яе кленчаць Св. Антоній і Св. Феадосій Пячэрскія [30, с. 194]. З прыведзенага фрагмента дамовы вынікае, што гэта мусілі быць асобныя абразы.

Дадзеная выява ў іканастасе, відавочна, знаходзілася па цэнтральнай асявой вертыкалі, якая была прадстаўлена наступным чынам (знізу ўверх): Царская Брама, "Спас Нерукатворны", "Хрыстос мые ногі Апосталам", "Божая Маці Кіева-Пячорская", "Каранаванне Божай Маці". Апошняя з названых выяў у дакуменце фігуруе як "Троіца з Багародзіцай". На

PolotskSU



нашую думку, зыходзячы са складу персанажаў, гэта была менавіта кампазіцыя “Каранаванне Багародзіцы”, дзе была адлюстравана і Дзева Марыя, і Бог-Айцец, і Бог-Сын (Ісус Хрыстос), і Св. Дух (у выглядзе голуба).

З дакументаў, дзе вядзецца гаворка пра абнаўленне іканастаса Мікалаеўскай царквы, вядомы імёны і некаторых іншых майстроў, акрамя Г.І. Маскалёва. Так, памочнікам у яго быў штатны служыцель манастыра і адначасова вучань названага жывапісца Іван Восіпаў (Иван Осипов) [27, арк. 2 – 3]; разьбяр Уладзімір быў прысланы з іншага манастыра, што вынікае з ліста архімандрыта Мяфодзія той (не ўказанай) абіцелі на імя архімандрыта Маркава манастыра [31, арк. 3]. У сваім артыкуле, прысвечаным мастацкім работам у Маркавым манастыры ў першай палове XIX ст. Н. Трыфанава, са спасылкай на «Книгу прихода и расхода денег за 1851 г.» пералічвае выплаты майстрам, якія тады ажыццяўляліся. Адсюль вынікае, што іканастасная аснова для Мікалаеўскага храма была заменена. Так, манастырскія выдаткі на гэтыя патрэбы былі такія: *“в апреле: казённому крестьянину Ивану Михайлову столяру за произведённые им столярные работы по иконостасу Николаевской церкви выдано по расчёту двадцать рублей семдесят копеек. В ноябре и декабре: семейным штатным служителям на содержание их самих с семействами и одежду, выдано столярам за работы в сём году по устройству иконостаса с особенными кивотами Николаевской церкви Савве Григорьеву, Николаю Иванову, малеру Василию Владимирову за работы по тому же иконостасу и и расписанию церкви четырнадцать рублей шестьдесят шесть копеек”* [6, с. 101]. Пазалотай разьбы, дарэчы, займаўся ўжо знаёмы нам майстар Іван Сяўрукаў, які дагэтуль залаціў іканастас Пакроўскай царквы [6, с. 101]. Такім чынам, чатырох’ярусны іканастас Мікалаеўскай царквы, зроблены, хутчэй за ўсё ў 1730 г., быў заменены новым у 1849 – 1851 гг. Паколькі некаторыя абразы з розных чыноў са старога іканастаса ў гэты час рэстаўраваліся, то відавочна, што яны занялі месца ў новым іканастасе, які таксама быў чатырох’ярусным.

Чарговыя працы па рэстаўрацыі царкоўнага жывапісу праходзілі ў 1890 г. Акалічнасці гэтай не вельмі паспяховай для манастыра кампаніі вядомыя са скаргі жывапісца – дваряніна Паўла Артамонавіча Зыкава Полацкаму і Віцебскаму Епіскапу Антонію на заказчыка – архімандрыта Антонія за нявыплату ім усіх грошаў [32]. Са справы вынікае, што ў кожнага з бакоў была свая версія гэтай сітуацыі. Што датычыцца пытанняў па нашай тэме даследавання, то гэтая справа іх амаль не закранае: гаворка тут ідзе пераважна пра сценапіс у Троіцкай і Пакроўскай цырквах, які павінен быў паднавіць або напісаць у новых месцах названы мастак.

Аднак маецца і адна цікавая для нашага разгляду згадка. У каштарысе прыведзены пералік работ П.А. Зыкава для манастыра з указаннем коштаў, і там сярод іншага фігуруе малюнак іканастаса за 5 руб. Відавочна, гаворка ідзе пра накід (ці праект) новай алтарнай агароджы, праўда не ўказана ў які храм. Пэўнае святло пралівае тлумачальны ліст архімандрыта на імя епіскапа пра сутнасць канфлікту з жывапісцам, дзе маецца такая згадка: *“Зыков ничтожной работы не делал не условившись прежде о цене, даже за наброску на бумаге придельного иконостаса и за то он условился 5 руб.”* [31, арк. 21 адв.]. Улічваючы тое, што ўсе іншыя жывапісныя работы датычыліся Троіцкай і Пакроўскай цэркваў і, ведаючы з гісторыі манастыра, што ў 1890 г. быў асвечаны бакавы **прыдзел у Пакроўскай царкве ў імя Евангеліста Марка**, то можна зрабіць выснову, што П.А. Зыкаў намаляваў іканастас менавіта для яго.

У апісанні Пакроўскай царквы за 1912 г. маецца інфармацыя і пра гэты прыдзел. Іканастас у ім быў невялікі, аднаярусны. Справа ад Царскай Брамы, на якой выявы чатырох Евангелістаў і Дабравесця, - роставая выява Хрыста, далей - паўднёвыя дыяканскія дзверы з выявай Св. Прарока Ісаі, далей храмавы абраз Евангеліста Марка. Злева ад Царскай Брамы – роставая выява Багародзіцы, ля яе – паўночныя дзверы з выявай Прарока Цара Давыда, ля іх – Св. Арханёл Міхаіл. Над Царскай Брамай – абраз “Увядзенне Багародзіцы ў храм” [33, арк. 34 адв. – 35]. Тут звяртаюць на сябе ўвагу дыяканскія дзверы з выявамі Прарокаў, што было даволі рэдкай практыкай.

Пры прыбудове да царквы прыдзела Св. Марка сіметрычна была дабудавана і панамарня, над якой таксама, што вынікае з апісання за 1912 г., размяшчаўся храм: *“С северной стороны над пономарнею в виде иконостаса: резные насквозь золочённые двустворчатые двери на подобие Царских Врат с изображениями Благовещения Пресвятой Богородицы и евангелистов. Местные иконы: Спаситель, благословляющий в рост; Божия Матерь с Богомладенцем на руках в рост. За южной дверью Святитель Митрофан епископ Воронежский, за северной дверью Святые Апостолы Пётр и Павел. На южной двери Святый Архистратиг Михаил. На северной двери Святый Архистратиг Гавриил. Над царскими вратами Спаситель, сидящий на троне, по правой стороне Святый Симеон Богоприимец, по левую Святый Иоанн Богослов».*

Такім чынам, у выніку праведзенага даследавання былі выяўлены і сістэматызаваны звесткі пра сюжэтны склад і структуру іканастасаў храмаў Маркава манастыра ад канца XVII да канца XIX ст. абагуленыя звесткі для зручнасці прадстаўлены ў табліцы ніжэй. Было ўстаноўлена, што іканастасы, змайстраваныя ў XVIII ст., мелі разгорнутую праграму і складаліся з трох – чатырох чыноў. А самы старажытны іканастас гэтага манастыра з вядомых на сённяшні дзень – у Троіцкай царкве, змайстраваны ў 1690 г., меў пяць ярусаў, а не тры ці чатыры, як часама указвалася ў ранейшых публікацыях. У прыдзельных цэрквах, асвечаных у XIX ст., іканастасы ўстанаўліваліся невысокія, што з’яўляецца заканамернай практыкай, бо звычайна памеры памяшкання не дазваляюць у прыдзелах уладкаваць высокую агароджу. У архіўных крыніцах, выкарыстаных для артыкула, фігуруе шэраг імёнаў майстроў, вывучэнне мастацкай дзейнасці якіх можа стаць тэмай асобнага даследавання.

| Храм | Год вырабу іканастаса | Колькасць чыноў |
|---|---|---|
| Св. Троіцы | 1690 | 5 |
| прыдзел Уваходу ў Ерусалім | 1-ая трэць XIX ст. | 2 |
| | | |
| Пакрова (халодная) | 1777 (?) | 4 |
| Св. Пятра і Паўла (цёплая) / прыдзел Св. Мітрафана | 1777 (?) / 1846 | 3 |
| прыдзел над панамарняй | 1890 (?) | 2 |
| прыдзел Св. Евангеліста Марка | 1890 | 1 |
| | | |
| Св. Мікалая | 1730 (?) | 4 |
| | 1849 – 1851 | 4 |
| | | |
| Св. Параскевы | 1840 – 1841 | 3 |

PolotskSU



**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Грывянёў, А.Л. Цэрквы Віцебскага Маркава манастыра / А.Л. Грывянёў // Архіварыус. – 2011. – Вып. 9. – С. 115 – 121.
2. Страчаная спадчына / Т.В. Габрусь, А.М. Кулагін, Ю.У. Чантурыя, М.А. Ткачоў; уклад. Т.В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.: іл.
3. Павлинов, А.М. Древние храмы Витебска и Полоцка. Деревянные церкви в г. Витебске / А.М. Павлинов // Труды IX археологического съезда в Вильне 1893 г. — М.: 1895. — Т.1 – 27 с.
4. Красавицкий, П.М. Памятники церковной старины Полоцко-Витебского края и их охранение / П.М. Красавицкий // Полоцко-Витебская старина. – Витебск, 1911 г. – С. 1 – 54.
5. Трифонова, Н.Я. Троицкая церковь Маркова монастыря и её росписи / Н.Я. Трифонова // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канфер., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з Дня нараджэння А.Р. Брадоўскага, 22 – 23 кастр. 2009 г., Віцебск / рэдкал. : Г.У. Савіцкі [і і нш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 203 – 209.
6. Трифонова, Н.Я. Художественные работы в Витебском Марковом монастыре в первой половине XIX века / Н.Я. Трифонова // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковай канферэнцыі, Віцебск, 23 – 24 кастрычніка 2014 г. / Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Віцебскага аблвыканкама, Віцеб. абл. краязн. музей ; рэдкал. : Г.У. Савіцкі [і і нш.]. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2017. – С. 98 – 102.
7. Вакар, Л.У. Помнікі царкоўнай даўніны Віцебшчыны як узоры мастацтва прымітыва / Л.У. Вакар // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канфер., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з Дня нараджэння А.Р. Брадоўскага, 22 – 23 кастр. 2009 г., Віцебск / рэдкал. : Г.У. Савіцкі [і і нш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 209 – 217.
8. Смыкоўская, І.І. Пеўчы зборнік з Віцебскага Свята-Троіцкага Маркава манастыра: праблема атрыбуцыі / І.І. Смыкоўская // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навук. канфер., прысвеч. 50-годдзю знаходкі берасцяной граматы ў Віцебску і 150-годдзю з Дня нараджэння А.Р. Брадоўскага, 22 – 23 кастр. 2009 г., Віцебск / рэдкал. : Г.У. Савіцкі [і і нш.]. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 217 – 223.
9. Ветер, Э.И. Об особенностях белорусского иконостаса // Художественное наследие. Хранение, исследование, реставрация. – 1978. – № 4 (34). – С. 186 – 191.
10. Духан, И.Н. О программе и составе иконостасов Белоруссии XVII – XVIII вв. // Советское славяноведение. – 1988. – № 2. – С. 70 – 84.
11. Кацер, М.С. Народно-прикладное искусство Белоруссии (от первобытного общества до 1917 г.). – Минск : Вышэйшая школа, 1972. – 204 с. : илл.
12. Сергий, иеромонах. Витебский Марков Свято-Троицкий мужеский монастырь / сочинение иеромонаха Сергия (Василевского) // Памятная книжка Витебской губернии на 1865 г. / издана Витебским губернским статистическим комитетом под редакцией А.М. Сементовского. – Санкт-Петербург : типография Вульфа, 1865. – С. 3 – 74.
13. Витебский Марков Свято-Троицкий мужеский монастырь: сочинение иеромонаха Сергия (Василевского), впервые опубликованое в 1865 году, дополненное предисловием, примечаниями и послесловием В.Б. Атапина в году 2015. – Витебск : Витебская областная типография, 2015. – 111 с. : ил., цв. ил., факсим.
14. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 22. – Входящие и исходящие документы за 1800 – 1803 гг. История и описания монастыря за 1800 г., описание деревень монастыря за 1800. (польск., рус.). – 1800 – 1803. – 317 арк.
15. ИИМК РАН, архив. – Фотоотдел. – О. 596. – Альбом фотографий Витебского Маркова монастыря.
16. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 36. – Описи имущества маркова монастыря и его церквей: соборной Троицкой, Покровской, Николаевской, Параскевской за 1818 и 1830 гг. (рус.). – 41 арк.
17. Флікоп-Світа, Г.А. Пакутніцкі цыкл ва ўніяцкіх іканастасах храмаў беларусі: выяўленне звестак пра страчаную спадчыну / Г.А. Флікоп-Світа // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фалькларыстыкі. Вып. 25 / Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі ; навук. рэд. А.І. Лакотка. – Мінск : Права і эканоміка, 2018. – С. 346 – 352.
18. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губернии / Издание А. Сапунова и князя В. Друцкого-Любецкого. – Витебск : губернская типолитография, 1896. – 262 + 144 с. : ил.
19. Струков, Д. Альбом рисунков. 1864 – 1867 / Редкол. : Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 308 с.
20. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 97. – Входящие документы и протоколы заседаний архимандрита и братии Витебского мужского Троицкого Маркова монастыря за 1842, 1846 гг. Контракт между вяземским мещанином Смоленской губернии И. Севрюковым и монастырём от 4 февраля 1846 г. на позолоту иконостаса монастырской покровской церкви, лл. 7-8 об. – 1842- 1846. – 9 арк.
21. Фликоп-Свито, Г.А. Иконостасы белорусских православных и греко-католических храмов в XVII – начале XIX века. Сравнительный аспект / Г.А. Фликоп-Свито // Обсерватория культуры. – 2016 г. – Т. 13. – № 5. – С. 564-574.
22. Флікоп-Світа, Г.А. Іканастасы ўніяцкіх храмаў Беларусі. Пошук новых мастацкіх формаў (другая палова XVIII – пачатак XIX ст.) / Г.А. Флікоп-Світа // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016 г. – № 12. – С. 24-32.
23. Флікоп-Світа, Г.А. Іканастасы ўніяцкіх храмаў Беларусі. Ад цяблавай канструкцыі да архітэктурнага твора (XVII – XVIII ст.) / Г.А. Флікоп-Світа // Беларускі гістарычны часопіс. – 2016 г. – № 10. – С. 23-36.
24. Известия императорской археологической комиссии. Выпуск 61-ый (вопросы реставрации, вып. 17). – Петроград : типография Главного Управления Уделов, 1916. – 242 с. : 122 илл.
25. ИИМК РАН. – Фонд I. – 1898 г. – Д. 249 – о принятии мер к охранения храма в с. Головенчицы, Могилёвской губернии, построенного Петром 1. – 1898 – 1908. – 61 л.
26. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 82. – Контракт монастыря со смоленским мещанином живописцем Г.И. Москалёвым от 10.12.1839 г. на написание нового иконостаса в Петропавловской монастырской церкви. – 1839. – 1 арк.
27. НГАБ. – Ф. 2694. – Воп. 1. – Спр. 650. – Указы Полоцкой духовной консистории от 31 января 1846 г. и 28 ноября 1847 г. о разрешении восстановления иконостаса Покровской церкви Витебского Маркова монастыря и ремонта его Петро-Павловской церкви и возобновлении Митрофановского придела первой церкви. – 1846-1847. – 4 арк.

PolotskSU



28. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 90. – Договоры со смоленским живописцем Г. Москалёвым от 26.08.1840 г. о росписи иконостасов в Параскевской и от 01.01.1849 г. - в Николаевской монастырских церквях. – 1840-1849. – 3 арк.
29. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 103. – Акт от 4 октября 1842 г. об освидетельствовании перестроенной параскевской церкви монастыря. – 2 арк.
30. Флікоп-Світа, Г.А. Беларускі іканапіс XVI – першай паловы XX ст.: альбом / Г.А. Флікоп-Світа; навук. рэд. Б.А. Лазука. – Мінск: Беларуская навука, 2019. – 365 с.: іл.
31. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 165. – Контракт со смоленским мещанином живописцем Г.И. Москалёвым на иконописные работы для Никольской церкви при монастыре. – 1849. – 4 арк.
32. НГАБ. – Ф. 2548. – Воп. 1. – Спр. 483. – Дело по жалобе художника П. Зыкова за неуплату ему денег архимандритом маркова монастыря в Витебске за проведённые работы. – 1890 – 1891 гг. – 34 арк.
33. НГАБ. – Ф. 2694. – Воп. 1. – Спр. 650. – Клировая ведомость Полоцкого Спасо-Ефросиньевского монастыря за 1864 г. и описи имущества келий и иконостаса Витебского троицкого Маркова монастыря за 1912 г. – 1912. – 37 арк.

**Пералік скарачэнняў**
Воп. – вопіс
Д. – дело
ИИМК РАН – Институт истории материальной культуры Российской Академии наук (Санкт-Петербург)
НГАБ – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі
НГМ РБ – Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь
Оп. – опись
Спр. – справа
Ф. – фонд

## ICONOSTASIS OF TEMPLES OF MARKOV MONASTERY IN $17^{th}$ – $19^{th}$ CENTURIES: PROGRAM, MASTERS, STYLISTIC ANALOGUES

H. FLIKOP-SVITA

*The Orthodox monastery in Markaushchyna near Vitsebsk included several temples, the most important of which was the Church of Holy Trinity, where from the end of $17^{th}$ to the beginning of the $20^{th}$ century there was a five-tier iconostasis – a fine example of the Belarusian Baroque iconostasis. This artifact, captured in the pictures, has repeatedly attracted the attention of specialists, but the iconostasis of other temples of Markov Monastery, which were later fashioned, have never been the object of special study. Meanwhile, the study of their stylistics and story structure gives an idea of the artistic evolution and development of the altar barrier of Belarus in general and the city of Vitsebsk for privacy. In this article, on the basis of archival materials, the scientific reconstruction of the iconostasis program in the monastery churches of Holy Trinity, St. Peter and Paul, The Intercession, St. Paraskevi, St. Nicholas and lateral appendages.*
***Key words:*** *iconostasis, Markau manastery, Vitebsk, church interior.*

УДК 398.1

## ПРЕДАНИЯ СЕБЕЖСКОГО КРАЯ (ПО МАТЕРИАЛАМ ФОЛЬКЛОРНОГО АРХИВА ПСКОВСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА)

**Юрчук Л.А.**
Российская Федерация, Псков

*В статье представлены итоги изучения преданий Себежского края, собранных в ходе фольклорных экспедиций Псковского государственного университета 1978 – 2011 гг. и сосредоточенных в фондах фольклорного архива университета. В ходе проведённого исследования выявлены циклы себежских преданий (среди них в материалах фольклорного архива ПсковГУ количественно преобладают предания о заселении и освоении края, предания об исторических лицах и о силачах), определены ведущие мотивы преданий, в том числе топонимические мотивы, репрезентирующие физическое пространство окружающего мира. В статье отмечена специфика современного состояния жанра преданий в Себежском крае: сокращение традиционного фонда, доминирование конкретно-исторического подхода к действительности, забвение рассказчиками исторической основы сюжета, их сомнения в достоверности передаваемой изустно информации, редукция сюжетов.*
***Ключевые слова:*** *предания, предания и заселении и освоении края, топонимические предания, мотив, фольклорный текст*

Себеж, впервые упомянутый польским хронистом Матвеем Стрыйковским в летописи под 1414 г. как пригород Псковской республики, разоренный польским князем Витовтом, на протяжении всего средневековья был краем приграничных междоусобиц. Он принадлежал Великому княжеству Литовскому, с 1535 г. входил в состав России, с 1579 г. – в состав Речи Посполитой. Окончательно к России Себеж отошел лишь в 1772 г., получив статус уездного центра Полоцкой провинции Псковской губернии, с 1778 г. – уездного города Полоцкого наместничества. С 1796 г. он находился в составе Белорусской губернии, в 1924 г. вновь вошел в состав Псковской губернии, при этом в 1924 г. «в некоторых сельских местностях доля белорусов достигала 80%. <…> Однако тесные контакты с живущим там же русским населением привели к быстрой ассимиляции белорусов, смене их этнического самосознания. В результате почти всё население южных районов Псковской области стало считать себя русским» [1, с. 135]. Согласно данным переписи 2002 г., русские составляют почти 93 % жителей Себежского района.

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ: ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:**
**ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ**
**І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп’ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^1/_8$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.